Невядомае пра вядомых

# АНЭЛЯ ТУЛУПАВА — ЧАЛАВЕК-МОРА, ЧАЛАВЕК-ЗОРКА

**Яна мела тры вялікія мары: даляцець да зорак «і самой паглядзець як там што на самай справе», вылечыць усіх анкалагічных хворых, напісаць багата кніжак. Яна любіла мора і палёты на самалётах. Была добрай лекаркай, таленавітай дыктаркай, адоранай паэткай і аўтаркай песень, перакладчыцай. Уважлівай жонкай і клапатлівай маці, бабуляй. А яшчэ — вялікай пакутніцай і шчырай верніцай...**

Але чаму — была? Яе песні і сёння гучаць па радыё і са сцэны, вершы, паэмы і апавяданні захапляюць чытачоў, а жыццё застаецца прыкладам спагады да чалавека, неверагоднай дабрыні і вялікай самаахвярнасці. Яна — ёсць. Сёння разам з яе дачкой Алесяй Саротнік (далей — **А.С.**) і ўнучкай Валерыяй (далей — **В.С.**) мы ўспамінаем маці, бабулю Анэлю Тулупаву. Яна пайшла з жыцця з-за цяжкой хваробы, перад смерцю прыняўшы таемны пострыг і стаўшы манахіняй Неанілай...

***— Пытанне пра таемнае манаства паэткі Анэлі Тулупавай, напэўна, — адно з найскладанейшых, але разам з тым яно ўзнікае найчасцей. Як сям'я, сябры ўспрынялі гэты крок? Ці зразумелі, прынялі?***

**А.С.:** Зразумейце, калі ласка: таемнае манаства на тое і таемнае, каб пра яго *не даведаліся.* Што да сяброў — для некага гэта быў шок, для «мірскіх» сяброў, дарэчы. Але я не памятаю асаблівых рэакцый з боку тых, для каго гэта сапраўды мела сэнс. А мы — нам давялося даведацца таму, што трэба было адзяваць і хаваць яе па асабістым чыне. Зразумелі, прынялі — пра гэта гаворка не ідзе, чалавек ішоў да гэтага і гэтага хацеў, усё астатняе — паміж ёй і Богам. Кропка.

***— Напэўна, ёй было складана несці паслух, манаства не ў сценах манастыра, дзе гэта заканамерна і цалкам укладваецца ва ўспрыманне людзей, але дома, у грамадстве?***

**А.С.:** Адкажу, як змагу. Па-першае, ізноў таемны пострыг павінен заставацца таемным, разумееце? Пра паслушэнства мы не можам ведаць. Канешне, можна заўважыць тое, што на паверхні — бо чалавек пакрысе змяняецца. Яна некаторы час паспела яшчэ паездзіць па святых месцах, нават да некалькіх старцаў. Па-другое, пострыг, як мы даведаліся пры пахаванні, адбыўся незадоўга да яе смерці — а тады ўсё было цяжка...

***— Калі я слухала радыёперадачу «Крылы» з Галінай Шаблінскай, гераіняй якой неяк была ваша мама, бабуля, то звярнула ўвагу на адно яе выказванне. Нягледзячы на тое, што спадарыня Анэля прайшла шмат выпрабаванняў у сваім жыцці, яна кажа, што была шчаслівая нават у самыя страшныя гады, знаходзіць станоўчае нават у часы ваеннага ліхалецця. Кажа, што людзі былі добрыя і спагадлівыя. Як лічыце, дзе крыніца такога шчасця, бязмернай веры ў чалавека?***

**А.С.:** Мне гэта падаецца вызначальнай рысай усяго пасляваеннага пакалення — падумайце самі, каб перажыць такое бедства, як вайна, трэба знаходзіць у сабе моц верыць, што важна — верыць у людзей. Бо як інакш? Вось і маці была такой.

***— Чытаючы расповеды пра жыццё Анэлі Тулупавай, дзіву даешся, колькі можа перажыць чалавек... Ваеннае дзяцінства, нястача, адукацыя акушэркі, ганаровае донарства, пошук свайго паэтычнага голасу. Здрада першага каханага. Але яе сэрца не ачарсцвела, яна не страціла веры ў свае сілы, захавала той самы «настрой пеўня» (як яна сама казала), каб змагацца і перамагаць. Проста неверагодны прыклад жыццёвай моцы такой маленькай жанчыны!***

**А.С.:** «Перажыць» тут не зусім карэктнае слова. Вы ж самі і сказалі пра «настрой пеўня» *(смяецца).* Маці нават на экзамены ішла з думкай: «Хто каго — я экзамены, ці яны мяне».



**З дачкой Алесяй і ўнучкай Валерыяй, 1995 год.**

Так што жыццёвыя нягоды і ўсё пагэткае для яе былі не іспытамі, якія трэба «перажыць», а хутчэй... выклікамі, калі можна так сказаць. Дуэлямі, з якіх яна выходзіла пераможцай. Усё атрымліваецца наадварот — яе жыццёвая смеласць і здольнасць рызыкаваць, тое, што яна не баялася браць на сябе адказнасць, яе «медыцынская» храбрасць і ўменне хутка і спакойна прымаць рашэнні — гэта ўсё і дапамагала не ачарсцвець яе сэрцу і розуму і прыцягвала да яе людзей.

***— Кажуць, што спадарыня Анэля мела дар прароцтва. Сама прыдумала сабе вобраз першага кахання і потым яго сустрэла, ён аказаўся менавіта такім, як яна ўяўляла. Прадказвала некаторыя рэчы і ў побыце. Ці сапраўды гэта так?***

**А.С.:** Смех смехам, але нешта такое было, так. Вось толькі, з яе ўласных слоў, яна, быў час, малілася, каб гэты дар, калі ён не ад Бога, знік. І ён знік. Думайце пра гэта, што хочаце.

***— Важную ролю ў жыцці жанчыны адыгрывае каханне, сям'я, рэалізаванасць у ролі маці, жонкі. Спадарыня Анэля тут раскрылася напоўніцу, была шчаслівай у шлюбе?***



**А.С.:** Сям'я ёсць сям'я — усяго было, і радасцяў і нягод, але ж жыццё з таго і зроблена. Маці, паверце, была даволі цвёрдым чалавекам, не схільным да сантыментаў. Бацька, дарэчы, адным з першых паверыў у яе як у паэта — дагэтуль захаваўся вялізны, тоўсты слоўнік Якуба Коласа, сапраўдны клад для лінгвіста ўвогуле, што казаць пра журналіста і пісьменніка, — які быў ягоным шлюбным падарункам.

**В.С.:** Што тычыцца мяне, не бяруся судзіць пра іх з дзедам і маці жыццё як сям'і, я не ведаю і не магу ад сябе сказаць, якой яна была маці, а якім бацькам быў мой дзед, — але яны былі адмысловымі дзедам і бабуляй. Гэта я асабіста ведаю дакладна і добра.

***— Валерыя, я ведаю, што вы таксама пішаце. Наколькі моцны ўплыў бабулі на вашу творчую індывідуальнасць?***

**В.С.:** Яна, скажам так, падрыхтавала глебу для таго, каб на ёй нешта літаратурнае пачало потым фарміравацца. Разумееце, бабуля памерла, калі мне было трынаццаць гадоў, і не сказаць, каб я многа пісала тады. Усё пачалося пасля яе сыходу з жыцця. Але я ўсё ж такі лічу бабулю своеасаблівым маяком — з боку стылю, як мінімум, з боку пабудовы верша і рыфмы.

***— Неяк ва ўспамінах вы пісалі, што часам, працуючы над новымі творамі, у думках спрачаецеся з бабуляй. У якіх пытаннях вашы меркаванні не супадаюць?***

**В.С.:** А давайце абыдземся, мабыць, толькі канстатацыяй факта? Бо гэта асабістыя рэчы, пра якія ведалі толькі мы з бабуляй. Што магу сказаць: ведаючы мой сённяшні характар і яе той, які я памятаю, цяпер спрэчак было б занадта многа — нават у плане побыту, што ўжо казаць пра філасофскія і рэлігійныя пытанні. Але, магчыма, з гэтай жа прычыны я так прагну час ад часу падзяліцца менавіта з ёю, а не з бацькамі ці сябрамі тым, што вынаходжу, — у літаратуры, у рэлігіі і гэтак далей.

***— Я чытала, што спадарыня Анэля не шкадавала лістоў, якія ёй пісалі, з лёгкасцю развітвалася з адзеннем, таму засталася толькі вясельная сукенка. А як жа з рукапісамі? Яны засталіся?***

**В.С.:** Нешта засталося — дарэчы некалькі рэчаў яна-такі здала ў архіў. Я вельмі добра памятаю, як у школьныя гады рашала задачкі на бабуліных старых рукапісах — гэта, па большай частцы, былі чарнавікі, канешне. Што не перашкаджала мне, замест таго, каб рабіць хатняе заданне, чытаць яе вершы.

***— Ці захоўвае архіў паэткі новыя творы, якія яшчэ чакаюць свайго шляху да чытача?***

**А.С.:** Чакае выдання пасмяротны зборнік «Мой сад» — яе выбранае і крыху самых позніх вершаў, што друкаваліся выключна ў перыёдыцы. І не ведаю, ці дачакаецца — бо ляжыць у выдавецтве каторы год. Трэба адзначыць, пры жыцці маці амаль не друкавала сваю прозу, — а яна ў яе ёсць. Калі мы збіралі да яе 65-гадовага юбілею інфармацыю пра ўсе творы, то ў слоўніку беларускіх пісьменнікаў знайшлі толькі тры вельмі раннія апавяданні. А ўжо значна пазней, вось у тых самых рэдкіх рукапісах, нам траплялася яшчэ колькі аўтабіяграфічных апавяданняў, што маці пісала ў 17-19 гадоў, яны нідзе не друкаваліся ў той час. А яшчэ, адна вялікая аповесць пра вайну. Амаль усё, акрамя аднаго апавядання, мы змаглі надрукаваць. Я мару пра зборнік матулінай прозы — хоць яе і не так многа было. Ці хоць бы пра перавыданне трох яе дзіцяча-падлеткавых твораў. І, канешне, працягваю спадзявацца, што аднойчы матулін «Мой сад», яе, так скажам, падвядзенне вынікаў жыцця, «прарасце» да чытачоў.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

**Фотаздымкі з сямейнага архіва Алесі і Валерыі САРОТНІК**



**Сустрэча з чытачамі.**

Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
**ЗАРЕГИСТРИРОВАНО**
17 марта 2016 г.
Сушко С.А.

**УТВЕРЖДЕНО**
Общим собранием участников
ООО «ЗападИнвестСистемз»
11.01.2016 (Протокол № б/н)

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ПЯТОГО ВЫПУСКА

### Общества с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз» (ООО «ЗападИнвестСистемз»)

Общество с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз» (далее – Эмитент) на основании Протокола заседания Общего собрания участников от 11.01.2016 № б/н вносит следующие изменения в Проспект эмиссии жилищных облигаций Общества с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз» (номер государственной регистрации 5-200-02-2513, дата государственной регистрации 03.03.2015) (далее – Проспект эмиссии):

1. Пункт 1.2 Проспекта эмиссии жилищных облигаций изложить в следующей редакции:

«**1.2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).**

220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 5-й этаж, офис 2.

Телефон/факс: 8 (017) 302-84-10.

Электронный адрес (e-mail): info@tapas.by».

2. Пункт 2.5 Проспекта эмиссии жилищных облигаций изложить в следующей редакции:

«**2.5. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.**

Исполнение обязательств по облигациям обеспечивается поручительствами:

1. Общества с ограниченной ответственностью «БелОбъектСтрой» на сумму 569 000 000 (Пятьсот шестьдесят девять миллионов) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 30.09.2015 № б/н.

Место нахождения поручителя: 223050, Минская область, Минский р-н, аг. Колодищи, ул. Чкалова, 37, пом. 1-2.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 691365787.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.10.2015 составляет 3 786 млн. белорусских рублей;

2. Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС ПЛЮС» на сумму 2 431 000 000 (Два миллиарда четыреста тридцать один миллион) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 30.09.2015 № б/н.

Место нахождения поручителя: 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 4-й этаж, офис 19.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 190976309.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.10.2015 составляет 58 789 млн. белорусских рублей;

3. Общества с ограниченной ответственностью «Агентство недвижимости «МЕГАПОЛИС» на сумму 2 800 000 000 (Два миллиарда восемьсот миллионов) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 11.01.2016 № б/н.

Место нахождения поручителя: 220114, г. Минск, ул. Филимонова, д. 22, офис 8.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 191602738.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.10.2015 составляет 2 892 млн. белорусских рублей;

4. Общества с ограниченной ответственностью «Торговый центр Пассаж» на сумму 920 000 000 (Девятьсот двадцать миллионов) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 30.09.2015 № б/н.

Место нахождения поручителя: 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 5-й этаж, офис 10.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 192153999.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.10.2015 составляет 14 919 млн. белорусских рублей;

5. Унитарного предприятия по оказанию услуг «Белскладкомплекс» на сумму 1 200 000 000 (Один миллиард двести миллионов) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 11.01.2016 № б/н.

Место нахождения поручителя: 223050, Минская обл., Минский район, а/г Колодищи, ул. Чкалова, д. 37, пом. 3.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 691548397.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.10.2015 составляет 68 917 млн. белорусских рублей.

В случае неисполнения или ненадлежащего исполнения эмитентом обязательств перед владельцами облигаций требования к поручителям предъявляются в письменной форме с приложением выписки по счету «депо», подтверждающей право собственности владельца на данные облигации и возможность их отчуждения (отсутствие ограничений, связанных с обременением облигаций обязательствами). Данное требование должно быть представлено поручителю по его месту нахождения.

Поручитель отвечает в том объеме, за который поручается.

При получении требования поручитель обязан рассмотреть его в срок, не превышающий 15 (Пятнадцать) календарных дней. При принятии положительного решения по вопросу исполнения обязательств эмитента по облигациям платеж в пользу обратившихся к поручителям владельцев облигаций осуществляется поручителем в течение 30 (Тридцати) банковских дней.

Договор о предоставлении поручительства вступает в силу с момента его подписания эмитентом и поручителем и действует в течение всего срока обращения облигаций, а также в течение трех месяцев после окончания срока обращения облигаций.

Действие договора о предоставлении поручительства прекращается после исполнения обязательств по облигациям (в том числе досрочного погашения всего выпуска облигаций) либо по истечении трех месяцев после окончания срока обращения облигаций, если владельцы облигаций не предъявят в указанный трехмесячный срок требований о выплате денежных средств по облигациям к эмитенту или к поручителю.

В случае принятия решения о ликвидации поручителя, а также в случае, если стоимость чистых активов поручителя, рассчитываемая на первое число каждого квартала, станет меньше объема находящихся в обращении облигаций, эмитент, в течение двух месяцев с момента возникновения одного из вышеперечисленного основания осуществляет полную замену обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям либо в части недостающей стоимости чистых активов данного поручителя или осуществляет досрочное погашение данного выпуска облигаций либо его части. В случае принятия эмитентом решения о полной замене обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям либо его части, эмитент вносит соответствующие изменения в Проспект эмиссии и в Решение о выпуске облигаций. Эмитент обязан зарегистрировать такие изменения в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь и в семидневный срок известить о данном факте владельцев облигаций посредством публикации соответствующей информации в периодическом печатном издании, определенном эмитентом для раскрытия информации.

Эмитент по собственной инициативе вправе принять решение о замене обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям с обязательным согласованием данного вопроса с владельцами облигаций до принятия данного решения эмитентом. Замена обеспечения осуществляется эмитентом после внесения соответствующих изменений в Проспект эмиссии и в Решение о выпуске облигаций. Эмитент обязан зарегистрировать такие изменения в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь и в семидневный срок оповестить о таких изменениях владельцев облигаций посредством публикации соответствующей информации в периодическом печатном издании, определенном эмитентом для раскрытия информации.

При несогласии владельца(ев) облигаций с заменой эмитентом обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям владелец(цы) облигаций вправе предъявить эмитенту облигации к выкупу в течение 60 (Шестидесяти) календарных дней с момента получения письменного уведомления о замене эмитентом обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям. В данном случае замена эмитентом обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям осуществляется после удовлетворения требований владельцев облигаций, несогласных с заменой эмитентом обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям. Выкуп облигаций производится в аналогичном порядке, определенном пунктом 2.14 настоящего Проспекта.».

3. Пункт 2.7 Проспекта эмиссии жилищных облигаций изложить в следующей редакции:

«Проведение открытой продажи облигаций осуществляется эмитентом ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 по адресу: 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17.

Открытая продажа облигаций осуществляется физическим и (или) юридическим лицам в соответствии с законодательством Республики Беларусь путем заключения соответствующего договора.

Жилищные облигации имеют право приобретать (как в процессе размещения жилищных облигаций, так и в процессе их обращения) юридические и физические лица, заключившие с эмитентом договор в простой письменной форме (далее – договор с эмитентом), предусматривающий обязательства эмитента по строительству жилых помещений владельцам жилищных облигаций.

Открытая продажа облигаций осуществляется по цене, определяемой эмитентом в зависимости от ситуации на рынке строительства и недвижимости на момент продажи жилищных облигаций, а также исходя из соотношения спроса и предложения на рынке ценных бумаг.».

4. Остальной текст Проспекта эмиссии жилищных облигаций остается без изменений.

Генеральный директор
Управляющей компании эмитента — И.Я. Кривецкий
Ответственный бухгалтер Эмитента — О.Э. Мышаковская
от поручителя
ООО «БелОбъектСтрой» в лице директора — П.Е. Титлов
от поручителя
ООО «ТАПАС ПЛЮС» в лице директора — С.П. Ставер
от поручителя
ООО «Агентство недвижимости «МЕГАПОЛИС»
в лице директора — Ф.А. Катиков
от поручителя
ООО «Торговый центр Пассаж»
в лице управляющей компании
ООО «ТАПАС ИНВЕСТКАПИТАЛ»
в лице заместителя управляющего
по экономике и финансам — И.С. Партнова
от поручителя
Унитарное предприятие
«Белскладкомплекс» в лице управляющего — ИП Добровольский А.А.
Директор Департамента финансовых
рынков ОАО «БПС-Сбербанк» — С.А. Стецюра

УНП 191755772